**В. Л. Гуцько**

# ГІСТОРЫЯ СПАДЧЫНЫ НЯСВІЖСКАГА ЗАМКА І ЯГО ЗЯМЕЛЬ: РОД РАДЗІВІЛАЎ І ВІТГЕНШТЭЙНАЎ

У артыкуле разгледжана сістэматызацыя спадчыны Радзівілаў на аснове калекцый мастацкіх партрэтаў іх нашчадкаў, што захаваліся ў сядзібах еўрапейскіх краін і пазначаны ў перапісах. Удакладняецца катэгорыя спадчыны для вызначэння каштоўнасці рэчаў паўсядзённага побыту арыстакратаў і іх саслоўнай культуры. На працягу некалькіх пакаленняў нашчадкаў роду Радзівілаў захоўваліся традыцыі стварэння асабістых партрэтаў, напісаных у розных манерах, – радавыя партрэты, пагрудныя, урачыстыя, пахавальныя. Асаблівая ўвага ў культуры арыстакратаў XIX стагоддзя надавалася стварэнню копій старадаўніх партрэтаў сваякоў і блізкіх. Да складу паўсядзённай культуры арыстакратаў неабходна далучыць мастацкі жывапіс, традыцыі пахавальнай культуры, узбраенне (дэманстрацыю зброі і рыцарскіх даспехаў), раскошныя інтэр’еры замка ці сядзібы, старажытную мэблю.

Спадчына Нясвіжскага замка і прылеглых зямель звязана з удакладненнем гісторыі ардынацый Радзівілаў, жыццяпісу прадстаўнікоў роду Радзівілаў і Вітгенштэйнаў.Актуальнасць і цікавасць да даследавання азначанай тэмы вынікае з паглыбленага вывучэння арыстакратычнай культуры і асаблівасцей яе праяўлення на беларускіх землях. У межах апісання паўсядзённасці Нясвіжскага замка вылучаецца шмат лакун, якія неабходна напоўніць фактalaгічнымі наратывамі, дзе былі б дакладныя звесткі і спасылкі на крыніцы вывучэння. Жыццяпіс Радзівілаў магчыма ўзнавіць на аснове гістарычных фактаў, мемуараў, занатаваных успамінаў сведкаў і сучаснікаў, інтэрпрэтацыі гістарычных дакументаў сучаснымі даследчыкамі. Сістэматызацыя вынікаў даследавання дапаможа выкарыстоўваць інфармацыю ў экскурсійных тэкстах, якія ўзбагацяцца новымі звесткамі. Зварот да мінулага нагадае пра значнасць сучаснага чалавека, будзе садзейнічаць атаясамленню асобы з жыццём продкаў, асэнсаванню лёсу папярэдніх пакаленняў. Разуменне гістарычнага мінулага ўзбагачае сучаснасць аповедамі пра былыя абставіны паўсядзённасці розных сацыяльных саслоўяў і паказвае каштоўнасць культуры беларускіх зямель. Далучэнне да разгляду спадчыны Радзівілаў дапаможа асэнсаваць арыстакратычную культуру і параўнаць яе з нормамі і каштоўнасцямі сучаснага грамадства.

Мэта артыкула – рэканструкцыя нематэрыяльнай спадчыны Нясвіжскага замка і яго зямель для вызначэння спецыфікі арыстакратычнай культуры, неабходнай для разумення духу культурна-гістарычных эпох і магчымасці семіятычнага аналізу.

Радзівілы становяцца шырокавядомымі з эпохі Вялікага Княства Літоўскага. Нясвіж у XV стагоддзі пераходзіць ва ўладанне Кішак – прадстаўнікоў аднаго з самых вядомых магнацкіх родаў на беларускіх землях. Горад быў перададзены Радзівілам у спадчыну па жаночай лініі каля 1533 г.

Знакамітыя асобы роду Радзівілаў праславілі Нясвіж і яго наваколле далёка за межамі беларускіх зямель. Землеўладанне падчас жыцця Мікалая Радзівіла Чорнага дасягнула неабсяжных памераў, таму князь падзяліў землі на тры ардынацыі (Нясвіжскую, Клецкую і Алыцкую) паміж сынамі. Ардынацыя (маярат) – «непадзельная і неадчужальная ўласнасць пэўнага магнацкага роду ў Рэчы Паспалітай» [1], якая перадавала права спадчыны па мужчынскай лініі з мэтай захавання зямель. Міхаіл Радзівіл Сіротка садзейнічаў наданню Нясвіжу магдэбургскага права і заклаў каменны падмурак для Нясвіжскага замка. Візіт польскага караля Аўгуста Панятоўскага ў Нясвіжскі замак, які адбыўся падчас уладарання Караля Станіслава Радзівіла (пане Каханку), меўся стаць намёкам польскаму каралю аб бязмежных магчымасцях магната і ўладальніка Нясвіжа.

Кожная з трох ардынацый мела асабістых уладароў з роду Радзівілаў. Нясвіжская ардынацыя захоўвала ўладальнікаў на працягу шматлікіх стагоддзяў, астатнія ардынацыі страцілі ўладароў на пачатку XVII стагоддзя. Землі ардынацый перайшлі да іншых уласнікаў, з якімі нясвіжскія Радзівілы ўступалі ў судовыя спрэчкі за права карыстання імі. Да прыкладу, землі Клецкай ардынацыі часова пераходзілі да Мінскай епархіі Рускай Праваслаўнай Царквы ў 1623 г., былі захоплены нашчадкамі роду Радзівілаў у 1618 і 1696 гг.. Пераказ гісторыі зямель узгадваецца ў крыніцы 1878 г.: «1618 г. – Крыжа-Уздзвіжанскі манастыр у мястэчку Цапра захапіў літоўскі князь Ян-Альбрэхт Радзівіл у сваё ўладаранне. Па скарзе віленскіх праваслаўных манахаў і брацтва галоўны трыбунальны суд дэкрэтам 1623 года жніўня 17 манастыр перадаў у валоданне Віленскага Свята-Духаўскага манастыра і брацтва. Князь Дамінік Радзівіл, карыстаючыся каптурным часам, 1696 г. лістапада 10 дня гвалтоўна захапіў і незаконна прысвоіў зямельныя надзелы манастыра і змяніў праваслаўны манастыр на унію. У манастыры знаходзіліся ўніяты-місіянеры да 1828 года, пакуль дзейнасць манастыра не была забаронена. Пабудовы манастыра былі спалены ў 1835 г.» [4, с. 261–262]. Прыведзены ўрывак нагадаў аб праблеме спадчыннай зямлі, якая была актуальнай у сутыкненні інтарэсаў розных саслоўных груп.

Узгадаем апісанне замка ў Нясвіжы, якое адносіцца да апошняй чвэрці XIX ст. (1878). Яго невядомы аўтар надаў Нясвіжскаму замку заселены статус, дзе пражывалі яго ўладальнікі ў асяроддзі наймітаў і слуг: «На паўночным баку горада, каля возера і сажалкі, якія падзяляюць Нясвіж на дзве часткі – усходнюю і заходнюю, на ўзвышшы стаіць вялікі, старажытны замак князёў Радзівілаў, пабудаваны як абарончая крэпасць, акружаны вакол чатырма высокімі бастыёнамі, у добрым стане і цяпер яшчэ заселены ў поўным складзе» [4, с. 179].

Найбольш паказальны элемент шляхецкай культуры – партрэтны жывапіс. Ён занатаваны ў перапісах маёмасці Радзівілаў і ўяўляў сабой партрэты прадстаўнікоў гэтага магнацкага роду, адлюстроўваў асяроддзе на палотнах. «Партрэтысты пішуць карціны ў традыцыі нямецкага і італьянскага позняга рэнесансу. Яго рысы моцныя ў партрэце Ежы Радзівіла. Мастакі арыентуюцца на ранняе барока Італіі, Фландрыі, Германіі, Польшчы. Гэта бачна ў партрэтах Барталамея Стробеля (1591 – пасля 1650) “Партрэт Януша Радзівіла”.

Мастак з кола Пітэра Данкерса дэ Рэя (1596–1661) “Партрэт Альбрыхта Станістава Радзівіла”, у якім бачны рысы іспанізму. Асабліва каштоўныя помнікі, якія стварылі мясцовыя мастакі. Іаган Шрэтэр (пам. 1685) працаваў у Вільні, Гродне, Нясвіжы. У нясвіжскай калекцыі “Партрэт Крыстыны Яўхіміі Радзівіл” (1635–1646) і “Партрэт жонак Януша IX Радзівіла Марыі і Катажыны” (1646), апошні датаваны і падпісаны гэтым мастаком» [2, с. 7].

Гісторыя калекцыі Радзівілаў была аб’яднана з гісторыяй калекцыі князёў Вітгенштэйнаў, калі быў заключаны шлюб паміж Львом Пятровічам Вітгенштэйнам (18 чэрвеня 1799, Езна – 20 чэрвеня 1866, Канны) з княжной Каралінай Луізай Валерыяй Стэфаніей Радзівіл (9 снежня 1809, Парыж – 26 ліпеня 1832, Бад-Эмс) у 1828 г.

Княжна Караліна Эмілія Луіза Валерыя Стэфанія Радзівіл, у замужжы графіня Вітгенштэйн, была адзінай дачкой князя Дамініка Іераніма Радзівіла, апошняга з нясвіжскіх Радзівілаў. Стэфанія Радзівіл атрымала ў спадчыну багатыя ўладанні на літоўскіх і беларускіх землях.

Маладая пара ў 1828–1830 гг. жыла ў Пецярбурзе. Салон графіні Стэфаніі наведвалі такія мастакі, як А. А. Арлоўскі, А. І. Ладзюёнер, Я. К. Канеўскі, які стаў сябрам сям’і. Леў Пятровіч набывае ў асабістую калекцыю сучасныя творы мастакоў. У палотнах прасочваліся тэндэнцыі рамантызму і сентыменталізму. Вынікам «італьянскага» перыяду ў гісторыі стварэння калекцый князёў Вітгенштэйнаў стаў збор у сядзібе Паўліна, які згодна з перапісам налічваў 89 карцін.

Падзея заўчаснай смерці Стэфаніі ў 1832 г. дала падставу для аб’яднання спадчыны нясвіжскіх Радзівілаў і роду Вітгенштэйнаў.

Сядзіба Вяркі, якую граф Л. П. Вітгенштэйн робіць радавой сядзібай (1839), адзначыла новы перыяд збору твораў калекцыі, у якую ўвайшлі партрэты Радзівілаў, рыцарскія даспехі і зброя, што былі вывезены з замка Радзівілаў у Нясвіжы. На працягу некалькіх год Леў Вітгенштэйн вёў судовы працэс з Радзівіламі. «У 1847 годзе князь Радзівіл падпісаў разам з князем Вітгенштэйнам канчатковы дакумент аб паздзеле спадчыны князя Дамініка» [5, с. 99]. У гэты ж час Л. П. Вітгенштэйн клапаціўся аб рэстаўрацыі саркафагаў у крыпце Фарнага касцёла (касцёла Божага цела) Радзівілаў.

З выбраных партрэтаў калекцыі Радзівілаў былі зроблены копіі ў 1830–1840-х гг. Копіі не падпісваліся, таму існуе складанасць іх вызначэння і аўтарства.

Зыход з жыцця ўласніка калекцыі, вывезенай з Нясвіжскага замка Радзівілаў, Л. П. Вітгенштэйна (1866) і продаж сядзібы Вяркі сталі падставай для вяртання калекцыі рыцарскіх даспехаў і зброі ў замак Радзівілаў (1900) [5, с. 489].

Нясвіжская ардынацыя існавала да 13 чэрвеня 1939 года [3], калі сейм Польшчы прыняў закон аб ліквідацыі такой формы землеўладання.

На аснове прыведзеных гістарычных фактаў і працы з навуковымі крыніцамі сістэматызуем прынцыпы складання калекцыі Радзівілаў і Вітгенштэйнаў, састаўныя часткі якой фарміруюць памяць пакаленняў, што грунтуецца на наступнай структуры:

- партрэтны жывапіс – жанры пахавальнага партрэта, урачыстага партрэта (партрэт у поўны рост), дзіцячы партрэт;
- копіі старадаўніх партрэтаў Радзівілаў, створаныя мастакамі XIX стагоддзя для распаўсюджвання сярод прадстаўнікоў знакамітага роду;
- рэканструкцыя саркафагаў і добраўпарадкаванне крыпты Фарнага касцёла Нясвіжа (касцёл Божага цела), якую распачаў граф Л. П. Вітгенштэйн;
- дэманстрацыя ўзбраення і рыцарскіх даспехаў, прыналежных прывілеяваным саслоўям арыстакратаў.

Раскошныя інтэр'еры замка – старажытная мэбля, паркет з інкрустацыяй з розных парод дрэва не лічыліся для прадстаўнікоў роду Радзівілаў асобнай каштоўнасцю ў XIX стагоддзі і не ўваходзілі ў перапіс калекцыі магнатаў. Інтрэр'ер выступаў неабходнай часткай паўсядзённай культуры, якая ўспрымалася арыстакратамі як належнае.

## ЛІТАРАТУРА


1. Ардынацыя // Асветнікі Беларусі (X – пач. XX ст.) : даведнік. – URL: https://slounik.org/asvietniki/ (дата звароту: 12.03.2024).
2. Жывапіс барока Беларусі / аўт.-склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : БелЭН ; МФКД, 2003. – 304 с.
3. Несвижские ординаты // История. Музей-заповедник «Несвиж». – URL: https://niasvizh.by/history/nesvizhskie_ordinaty/ (дата обращения: 10.03.2024).
4. Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтов сведениям (Прилож. к «Минским епархиальным ведомостям» за 1878 год). – Минск : Типо-Литография Ю. И. Соломонова, 1878. – 274 с. – III – Слуцкий уезд / Духовенство Русской Православной Церкви в XX веке: биографическая база данных и собрание материалов. – URL: https://pravoslavnoe-duhovenstvo.ru/library/material/14637/ (дата обращения: 12.03.2024).
5. *Попко, О. Н.* Художественные коллекции князей Витгенштейнов в контексте европейского искусства XIX в. : в 2 т. / О. Н. Попко. – Минск : Беларус. навука, 2023. – Т. 1: Живопись. – 558 с.